# 8-га САКАВІКА - ДЗЕНЬ ЖАНЧЫН. СА СВЯТАМ!

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

№ 5 (1018) | СЕРАДА, 6 сакавіка 2002 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

***ТЕБЕ, ТОБОЙ, ВО ИМЯ, РАДИ –
ВСЕ ЭТИ ЧУВСТВА И ЦВЕТЫ.
ВОСЬМЁРКОЙ В МАРТОВСКОЙ ДЕКАДЕ
ВСЯ БЕСКОНЕЧНОСТЬ КРАСОТЫ.***

Станислав ГАЛКОВСКИЙ.



Юрий ГУСЕВ

* * *

Некрасивых женщин не бывает.
Так им предначертано судьбой.
Каждая тюльпаном расцветает,
Лишь запахнет в воздухе весной.

Покорит пленительной улыбкой,
Добрым сердцем и сияньем глаз.
И пилить не будет за ошибки…
В трудный час помолится за нас.

Некрасивых женщин не бывает,
Пусть же каждая найдет мечту.
Красота их грешный мир спасает,
Защитим же эту красоту!

Сёння нашы словы звернуты да лепшай палавіны чалавецтва – жанчын. Яны гучаць у самым лепшым сэнсе. Жанчыны – гэта прадаўжальніцы чалавечага роду. Жанчыны – гэта нашы каханыя, нявесты, якія натхняюць на самыя высакародныя ўчынкі.

Жанчыны ў цяперашні дзень маюць выключнае значэнне ва ўсіх сферах эканамічнага і сацыяльнага развіцця. Няма такой галіны гаспадаркі, дзе б не знаходзілі прымяненне іх розум, веды і нестамляльныя рукі.

Свята жанчын адзначаецца з 1910 года. Яно лічыцца адным з самых светлых, бо звязана з надыходам вясны і аднаўленнем прыроды, са спадзяваннямі на лепшую будучыню. Раней і зараз мы не ўяўляем сваю жыццядзейнасць без удзелу ў ёй жанчын, іх аўтарытэт знаходзіўся і застаецца на высокім узроўні.

Нельга не прывесці некалькі лічбаў, якія характарызуюць ролю жанчын у нашым універсітэце. У складзе прафесарска-выкладчыцкага саставу іх колькасць перавышае 50%. Дзве жанчыны ўзначальваюць факультэты, адзінаццаць – кафедры. Прыкметнай стала перавага жанчын і сярод выхаванцаў універсітэта. Пры гэтым нельга не адзначыць, што паспяховасць дзяўчат значна вышэй, чым у прадстаўнікоў моцнага полу. Скажам і пра тое, што сярод 17 імянных стыпендыятаў (не ўлічваючы стыпендыятаў Савета ГДУ) 11 – студэнткі. Ва універсітэце шмат выдатных прадстаўніц і іншых сфер дзейнасці. Многія з іх сталі ветэранамі і заслужылі ўсеагульнае прызнанне і павагу.

***У гонар 8 Сакавіка горача і сардэчна віншуем усіх жанчын універсітэта са слаўным святам! Жадаем ім моцнага здароўя, асабістага і сямейнага дабрабыту, вялікіх поспехаў у працоўнай дзейнасці і вучобе!***

РЭКТАРАТ. ЖАНСАВЕТ.
ПРАФКАМ. ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ.

**З прыўзнятым настроем сустракаюць свята жанчын чацвёртакурсніца спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве" Святлана Лін (злева) і пяцікурсніца юрыдычнага факультэта Вераніка Брылёва. Яны сталі лаўрэатамі конкурсу, які праводзіўся спецыяльным Фондам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў у рамках мэтавай праграмы "Грамадазнаўству XXI стагоддзя – ініцыятыву і творчасць таленавітай моладзі Беларусі". Дзяўчаты ўдастоены адпаведных нагрудных знакаў і грашовых прэмій у памеры па 150 тыс. руб. Узнагароды ўручыў ім ва ўрачыстай абстаноўцы, як і яшчэ тром студэнтам нашага універсітэта, якія выйшлі пераможцамі III тура II Рэспубліканскага конкурсу творчых работ па грамадскіх навуках, рэктар ГДУ прафесар, член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі М.В.Селькін.**

**Фота У.Чысціка.**



## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

У апошні дзень лютага адбылося чарговае ў бягучым навучальным годзе пасяджэнне савета універсітэта. Першым на парадку яго дня стаяла пытанне аб арганізацыі аздараўлення студэнтаў і супрацоўнікаў ГДУ ў 2001 годзе. Яно абмеркавана пасля заслуханых інфармацый галоўнага ўрача санаторыя-прафілакторыя А.М.Сабалеўскага, намесніка старшыні прафкама Т.А.Ваўчковай, старшыні прафкама студэнтаў Н.І.Колтышавай. Прынятае рашэнне накіравана на паляпшэнне гэтай работы ў 2002 годзе.

Аб арганізацыі і метадычным забеспячэнні вучэбнага працэсу на завочным факультэце кафедрай усеагульнай гісторыі далажыў Савету яе загадчык дацэнт А.М.Бабкоў.

Інфармацыю аб бягучай рабоце навукова-метадычнага Савета ГДУ зрабіў прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар С.Ф.Каморнікаў. Пасля яго ж выступлення было зацверджана Палажэнне аб парадку планавання выдання вучэбна-метадычных матэрыялаў кафедрамі і факультэтамі універсітэта.

Савет зацвердзіў план навукова-даследчых работ на 2002 год і тэмы кандыдацкіх дысертацый аспірантам прыёму мінулага года.

З інфармацыяй аб выніках фінансавай дзейнасці універсітэта ў 2001 годзе выступіла галоўны бухгалтар І.А.Курава.

Савет прыняў рашэнне аб размеркаванні сродкаў, выдзеленых з бюджэту Рэспублікі Беларусь на фінансаванне фундаментальных даследаванняў у 2002 годзе. Вырашаны кадравыя і некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## ПА ДОБРАЙ ТРАДЫЦЫІ

У калектыве нашага універсітэта імкнуцца дастойна адзначыць самае светлае веснавое свята – Дзень жанчын. Да 8 Сакавіка ў выставачнай зале галоўнага корпуса прымеркавана выстава, на якой жанчыны дэманструюць сваю разнастайную творчасць і кулінарнае ўменне.

Сёння ў рэктараце адбудзецца ўрачыстасць, якая праводзіцца па ініцыятыве рэктарата, прафкама, прафкама студэнтаў, жансавета. Па прадстаўленню калектываў структурных падраздзяленняў на ёй ушануюць лепшых нашых працаўніц, студэнтак, а таксама тых жанчын, якія знаходзяцца ўжо на заслужаным адпачынку. Ім будуць уручаны грашовыя прэміі, выказаны шчырыя віншаванні і пажаданні, цёплыя словы ўдзячнасці за плённую працу і выдатную вучобу.

## Н.І.КОЛТЫШАВУ СЛУХАЛІ Ў КІЕВЕ

З 20 па 23 лютага ў Кіеўскім нацыянальным універсітэце імя Тараса Шаўчэнкі праходзіла пасяджэнне Еўразійскай асацыяцыі прафсаюзных арганізацый універсітэтаў у рамках IX з'езда Еўразійскай асацыяцыі універсітэтаў. У рабоце гэтага прафсаюзнага форуму ад нашага універсітэта ўдзельнічалі старшыня прафкама Г.І.Варатніцкі і старшыня прафкама студэнтаў кандыдат педагагічных навук, дацэнт Н.І.Колтышава.

Як паведаміў нам Г.І.Варатніцкі, у сувязі з тым, што прафсаюзныя арганізацыі ВНУ Беларусі цяпер аказаліся ў цяжкім матэрыяльным становішчы, усе расходы (за выключэннем аплаты за праезд) за знаходжанне беларускай дэлегацыі ў Кіеве ўзялі на сябе Маскоўскі дзяржаўны універсітэт імя М.В.Ламаносава і Кіеўскі нацыянальны універсітэт імя Тараса Шаўчэнкі.

На парадку дня пасяджэння прафсаюзных лідэраў, у якім прынялі ўдзел і рэктары класічных універсітэтаў, стаяла пытанне аб далейшым развіцці прафсаюзнага руху Еўразійскай асацыяцыі. У яго абмеркаванні прыняла ўдзел ад нашага універсітэта Н.І.Колтышава.

На сустрэчы рэктары класічных універсітэтаў вялі размову аб стане вышэйшай школы ў краінах СНД, двухузроўневай падрыхтоўцы спецыялістаў ва універсітэтах, аб іх фінансаванні і сацыяльнай палітыцы.

Для гасцей была наладжана шырокая культурна-пазнаваўчая праграма.

## *ВІНШУЕМ!*

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты гістарычнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры гісторыі Беларусі **ЗЕЛЯНКОВУ Алу Іванаўну** з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.*

* * *

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта горача віншуюць з нагоды прысваення Прэзідыумам БелВАКа вучонага звання дацэнт: **КАРАСЁВАЙ Галіне Леанідаўне** – з кафедры ВМ і праграміравання, **КОЛТЫШАВАЙ Надзеждзе Іванаўне** – з кафедры беларускай культуры, старшыні прафкама студэнтаў, **КРУКОЎСКАМУ Валерыю Пятровічу** – з кафедры спартыўных дысцыплін, **ПАЎЛОЎСКАМУ Аляксандру Іларыёнавічу** – з кафедры геаграфіі.*

НА АКТУАЛЬНУЮ ТЭМУ

# НАВІНЫ ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

З кожным днём набліжаюцца ўступныя экзамены ў вышэйшыя навучальныя ўстановы нашай краіны. І заканамерна, што паступова пачынае ўзрастаць хваляванне не толькі ў сёлетніх выпускнікоў сярэдніх школ, але і ў многіх з тых, хто ў папярэднія гады не здолеў паступіць у ВНУ і цяпер зноў поўны рашучасці здзейсніць сваю запаветную мару.

Не выпадкова ўсё больш будучых абітурыентаў цікавяць пытанні новых правіл прыёму ў дзяржаўныя ВНУ, якія адбыліся ў іх змяненні. На іх мы папрасілі адказаць прарэктара па вучэбнай рабоце нашага універсітэта доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара, намесніка старшыні прыёмнай камісіі С.Ф.Каморнікава.

***– Што ж новага сёлета з'явілася ў прыёмных правілах у параўнанні з 2001 годам?***

– Летась упершыню абітурыентам было прадстаўлена права паступлення ў некалькі ВНУ па копіях дакументаў. Аднак механізм рэалізацыі такога права адпрацаваны не быў. Асобныя абітурыенты па патрабаванню бацькоў, скарыстаўшы такую магчымасць, падавалі копіі дакументаў у 4-5 ВНУ. Затым гэтыя маладыя людзі, напрыклад, раніцай пісалі сачыненне ў Мінску або Віцебску, затым садзіліся ў аўтамабіль і ехалі ў Гомель з тым, каб тут паспець на вусны экзамен. Вынік такой "хуткаснай" здачы ўступных іспытаў няцяжка ўявіць. Каб пазбегнуць падобнага паўтарэння падзей, у 2002 годзе Правіламі прыёму прадугледжана магчымасць падачы дакументаў не больш чым у дзве ВНУ, а правядзенне ўступных экзаменаў арганізуецца ў два патокі: першы з 16 – па 23, другі – з 24 – па 31 ліпеня. Абітурыент, выбраўшы дзве ВНУ, падае ў іх прыёмныя камісіі арыгіналы або копіі дакументаў у перыяд з 25 чэрвеня па 15 ліпеня, указваючы пры гэтым паток, у якім ён будзе здаваць уступныя экзамены (у першым патоку ён здае іх у адной ВНУ, у другім патоку – у другой).

Да навін сёлетняга прыёму варта аднесці і тое, што ў гэтым годзе ўсе абітурыенты, якія прайшлі давузаўскую падрыхтоўку (вячэрнія і завочныя падрыхтоўчыя курсы, профільныя класы, падрыхтоўчае аддзяленне) ва ўсіх ВНУ будуць паступаць на агульных падставах. ВНУ маюць права праводзіць датэрміновае сумяшчэнне выпускных-уступных экзамены. Аднак з вынікамі такіх экзаменаў абітурыентам дазволена ўдзельнічаць у конкурсе толькі на мэтавыя і звышпланавыя месцы (навучанне на ўмовах аплаты). Дарэчы, наш універсітэт не праводзіць датэрміновыя сумяшчальныя экзамены для слухачоў падрыхтоўчых курсаў з 1998 года. Прымаючы такое рашэнне, мы зыходзілі з таго, што ўсе абітурыенты павінны мець роўныя магчымасці (у прыватнасці, роўную колькасць спроб паступлення ў ВНУ), а курсы павінны даваць толькі дадатковыя веды. У сістэме ж датэрміновых экзаменаў перавагу атрымоўваюць, як правіла, абітурыенты, якія жывуць у Гомелі і маюць магчымасць аплаціць кошт навучання, а абітурыенты з сельскай мясцовасці і раённых цэнтраў на такія экзамены не пападаюць.

***– Я звярнуў увагу, што Вы ўжываеце тэрмін "уступныя іспыты". Чаму?***

– Мне, і трэба меркаваць чытачам, больш звычна "уступныя экзамены".

Тэрмін "уступныя іспыты", на мой погляд, мае больш шырокі сэнс. У апошнія гады мы ўсе намусіці аддаляемся ад традыцыйных форм уступных экзаменаў. Напрыклад, на некаторых спецыяльнасцях у ГДУ ўступныя выпрабаванні па замежнай мове праводзяцца з аўдзіраваннем і лексіка-граматычным тэсціраваннем. Пры паступленні на шэраг спецыяльнасцей завочнай формы навучання ў якасці ўступных іспытаў устаноўлена субяседаванне.

***– Дарэчы, аб тэсціраванні. Ці залічваюцца вынікі цэнтралізаванага тэсціравання ў ГДУ?***

– У 2001 годзе колькасць прадстаўленых сертыфікатаў цэнтралізаванага тэсціравання ў нашу ВНУ ў параўнанні з 2000 годам павялічылася ў 10 разоў. Сёлета мы пашырым гэту практыку і будзем залічваць вынікі цэнтралізаванага тэсціравання ў адпаведнасці з прадстаўленымі сертыфікатамі на спецыяльнасці "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі" і "Геалогія і разведка месцанараджэнняў карысных выкапняў" па ўсіх прадметах, а на ўсе нефілалагічныя спецыяльнасці – па беларускай (рускай) мове і літаратуры. Таму хочацца парэкамендаваць тым, хто ўжо выбраў для сябе спецыяльнасць у нашым універсітэце, абавязкова прайсці тэсціраванне, якое пачнецца ўжо ў бягучым месяцы ў Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце імя П.О.Сухога.

***– Ці будзе наш універсітэт ажыццяўляць сёлета прыём па новых спецыяльнасцях?***

– У гэтым годзе ва універсітэце новыя спецыяльнасці адкрывацца не будуць. Змяненні ёсць толькі ў іх назвах. У сувязі з пераходам вышэйшай школы рэспублікі на новы класіфікатар спецыяльнасцей і кваліфікацый назвы некаторых спецыяльнасцей атрымалі змяненні. У прыватнасці, спецыяльнасць "Руская мова і літаратура" цяпер называецца "Руская філалогія", "Беларуская мова і літаратура" – "Беларуская філалогія", "Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны" – "Сусветная эканоміка", "Экалогія" – "Геаэкалогія".

***– А што з раздзяленнем конкурсу?***

– Залічэнне на ўсе спецыяльнасці сёлета будзе праводзіцца па асобнаму конкурсу сярод сельскіх і гарадскіх выпускнікоў прапарцыянальна пададзеным заявам. Лічу, што такая практыка карысная. Яна дазваляе захаваць для ВНУ выпускніка сельскай школы, залічваючы яго іншы раз пры меншым прахадным бале, чым у гарадскога абітурыента. Як правіла, сельскія абітурыенты прыкладна праз год даганяюць па ведах гарадскіх, а да заканчэння ВНУ нават становяцца лідэрамі на сваіх курсах. Пры такой практыцы бачны клопаты дзяржавы аб развіцці сельскіх рэгіёнаў, падтрымцы іх у вырашэнні кадравых праблем. На гэта, дарэчы, накіравана і сістэма мэтавага прыёму на педагагічныя спецыяльнасці.

***– Якія новаўвядзенні Вы яшчэ не закранулі?***

– Напрыклад, для інвалідаў І-ІІІ груп, а таксама дзяцей-інвалідаў сёлета патрэбна прадстаўляць заключэнні ўрачэбна-кваліфікацыйных камісій.

Жыхарам сельскай мясцовасці неабходна прадстаўляць даведку выканкама сельсавета, якая пацвярджае пастаяннае пражыванне ў сельскіх населеных пунктах не менш 2 гадоў.

Асобы, узнагароджаныя нагрудным знакам спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы здольных вучняў, студэнтаў і таленавітай моладзі, паступаючыя на адпаведныя спецыяльнасці, залічваюцца без уступных экзаменаў.

Без конкурсу пры атрыманні станоўчых адзнак на ўступных экзаменах залічваюцца дзеці з сем'яў асоб начальніцкага і радавога складу органаў фінансавых расследаванняў Рэспублікі Беларусь, загінуўшых (памерлых) пры выкананні службовых абавязкаў.

***– Дзякую, Сяргей Фёдаравіч, за вычарпальную гутарку.***

**Інтэрв'ю ўзяў У.БАЛОГА.**

## І ВЫНАХОДНІЦТВЫ – СПРАВА ЖАНОЧАЯ




Сёлета спаўняецца 10 гадоў, як Наталля Драбышэўская атрымала дыплом нашага універсітэта аб вышэйшай адукацыі. І ўвесь прайшоўшы час яна працуе ў Праблемнай навукова-даследчай лабараторыі перспектыўных матэрыялаў, прайшла некалькі службовых ступеняў і цяпер з'яўляецца яе навуковым супрацоўнікам.

Сярод калег Наталля вызначаецца прыкметнай схільнасцю да вынаходніцкай дзейнасці. Не яе рахунку ўжо 2 патэнты і 5 заявак на вынаходніцтвы, па якіх таксама чакае станоўчае рашэнне.

Свята жанчын Наталля Яўгенаўна сустракае з добрым настроем. І гэта не выпадкова. Яна – лаўрэат Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта па выніках праведзенага конкурсу за 2001 год для падтрымкі найбольш таленавітых маладых вучоных і спецыялістаў у намінацыі "Вынаходніцкая дзейнасць", за што ўдастоена адпаведнага дыплома і грашовай прэміі, якія былі ўручаны ёй на ўрачыстай вечарыне, прысвечанай Дню беларускай навукі.

# ФРАНЦУЗСКИЕ КАНИКУЛЫ



Недавно из Клермон-Феррана вернулись группы студентов 3 и 5 курсов Франко-Белорусского института управления. "Каникулы" во Франции, кто бы отказался? Европа мелькает за окнами автобуса, проносятся линиями электропередач родные места Шопена, Гете, Ремарка, а впереди приятная "неизвестность" нового. Правда, не такая уж "неизвестность" ждала наших студентов в Клермоне. План их пребывания был уже готов, изучаемые предметы проставлены в расписание. Поэтому "каникулы" получились очень насыщенным учебным процессом. Приходилось учиться с 8.00 до 20.00 (с двухчасовым перерывом на обед) и написать до 8 контрольных тестов за время пребывания во Франции. Приятно, что по итоговым оценкам они даже опередили французов.

В этом году впервые спрос на то, чтобы взять белорусских студентов к себе на проживание, со стороны их французских коллег превысил предложение. Еда (бесплатные талоны на питание), кров (жили у французских студентов), что еще надо настоящему студенту чтобы учиться.

По выходным, когда "грызть науку" уже невмоготу, белорусы изучали тамошние дискотеки и "элементы" молодежной культуры. Скучать им не давали, да и они сами не хотели. По инициативе наших студентов для них была организована двухдневная поездка в Париж, где они познакомились с достопримечательностями столицы, побывали в Лувре и просто побродили по улицам одного из самых красивых городов мира.

Что касается преподавания, то, по словам очевидцев, оно было весьма интересно, почти все лекции были выстроены в форме диалога, с применением наглядных примеров, да и довольно свободное поведение преподавателей сглаживало определенный межнациональный дискомфорт. Интересен тот факт, что многие французские преподаватели не только теоретики, но и практики. Помимо преподавания в институте они являются менеджерами, экономистами или директорами различных фирм. Это дает свои плюсы, так как человек не только знает, "как делать деньги", но и делает их. А если умеешь сам, легко научить другого. Очень приятно, что студенты не испытывали языковых проблем. Это говорит о высокой подготовке их здесь, на родине, хорошей работе преподавателей и самих студентов. Занятие в ФБИУ проходят после основных занятий. Это занимает довольно много времени, поэтому приходится себе в чем-то отказывать, чтобы чего-то добиться. А это так сложно, когда тебе 20, а за окном — весна.



**На снимке: содиректор Франко-Белорусского института управления, вице-президент университета Клермон-Ферран-1 профессор Морис Шеневуа среди гомельских студентов.**

Франко-Белорусский институт управления эксклюзивен в своем роде, ничего подобного в Беларуси не было и нет. В далёкой Франции студенты платят от 3 до 7 тысяч долларов в год, чтобы получить заветные "корочки". А здесь, в Гомеле, студент, не отрываясь от своей основной учебы, за сумму в десятки раз меньшую (примерно 260 долларов США в год), но с не меньшим желанием и целеустремленностью может получить то же самое. Не это ли экономически выгодно, не это ли первая победа будущих экономистов — профессии необходимой в условиях рыночной экономики. Еще один плюс ФБИУ в том, что если вы, по тем или иным причинам, не смогли продолжать учебу (к примеру, служба в армии или болезнь), то вы потом без проблем можете записаться на тот же курс. Поступать сюда может студент любого факультета и курса ГГУ им. Ф.Скорины. Есть вероятность, и она уже подтверждена неединичными фактами, что после окончания института французы пригласят вас доучиться. Этот процесс повышения квалификации длится один год, и после него получение высокооплачиваемой работы во Франции практически гарантировано. К тому же существуют промежуточные дипломы, которые даются по окончании второго, третьего и четвертого курса. Это дипломы помощника менеджера различных степеней. Здесь все плюсы хороши, но есть и свои сложности, необходимые и регламентированные — это постоянное посещение и очень интенсивный график учебы. Но кто хочет, тот добьется, "стучащему да откроют", а кто не ставит цели, тот и не получает.

Как говорит содиректор ФБИУ Александр Владимирович Гаврилюк — это не только диплом европейского образца, это возможность доказать самому себе, что ты не хуже других, что сам можешь создать свою жизнь, пусть не такую долгую во вселенских масштабах, но ту, где ты хозяин от начала и до конца.

**Станислав ГАЛКОВСКИЙ, студент 3-го курса физического факультета и 1 курса ФБИУ.**

Анна ЧУТАКОВА,
студентка гр. Б-11 филфака.

## МАТЕРИНСКОЕ СЕРДЦЕ

*Потемнело на улице снова,*
*Солнце скрылось за темною мглой.*
*Ты сидишь и не скажешь ни слова...*
*Свет не гаснет в квартире пустой.*

*И опять, и опять ты читаешь*
*Так давно прилетевший листок,*
*И слезу со щеки утираешь,*
*Губы шепчут упрямо: «Сынок...»*

*Приустали глаза от печали,*
*Поседела давно от невзгод.*
*А соседки не раз замечали:*
*«Ты не жди его, он не придет».*

*Только снова усталое сердце*
*Будет ждать телефонный звонок,*
*И, услышав его наконец-то,*
*Губы тихо прошепчут: «Сынок».*

*Ты опять просидишь до рассвета,*
*Вспоминая о прошлых годах,*
*Будут письма опять без ответа,*
*Холод мыслей и соль на глазах.*

*Сердце матери слез не боится.*
*В нем не гаснет любви огонек.*
*Ты уснешь, а оно будет биться,*
*Повторяя: «Ну, где ты, сынок?»*

## ЛУЧШЕ ДОРОГИХ ПОДАРКОВ

Часы пробили полночь. Минутная стрелка мирно описала круг циферблата. Родное лицо расплылось в улыбке. Улыбаешься во сне – чувствуешь, что сегодня – твой день. Ведь сегодня – 8 Марта.

Утро. У тебя – праздник. Но ты стремишься сделать праздник для других. А я знаю, как сделать тебя счастливой, чтобы ты действительно знала, что это – твой день.

Из твоих голубых глаз падают слезы. Боль? Да нет же! Слезы радости стремятся скорее скатиться по усталым щекам, чтобы упасть на букет красных роз. «Спасибо, что ты есть! Спасибо, мамочка!..»

Это, конечно, мелочь в сравнении с тем, что ты делаешь для меня. Но для тебя этот знак внимания – лучше дорогих подарков и лестных слов, напечатанных на купленной открытке...

**Ольга ЖЕВНОВА,**
**студентка гр. БА-13 филфака.**

**У папярэднім нумары нашай газеты было апублікавана інтэрв'ю студэнтак гр. РБ-33 філалагічнага факультэта Аксаны Луганскай і Алены Курносенка з членамі каманды КВЗ Белдзяржуніверсітэта, якая ў мінулым годзе стала пераможцай у саперніцтве з іншымі камандамі СНД. Гэты здымак быў зроблены для прыемнай памяці аб цікавай сустрэчы. Аксана і Алена сярод тых, хто з задавальненнем адказваў на іх пытанні.**



ВЫХАВАННЕ

## ЗРАЗУМЕЦЬ ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

*"Кветкамі жыцця" ўслед за класікам звыкла называем мы дзяцей. Аднак у нашы дні даволі частымі сталі так званыя сямейна-выхаваўчыя здарэнні, сведкамі якіх іншы раз мы становімся на вуліцы, у двары, у грамадскім транспарце. Маю на ўвазе выпадкі, калі якая-небудзь матухна, стаміўшыся ад капрызаў і свавольства свайго дзіцяці, тут жа пераходзіць на рукапрыкладства. Пры гэтым яна зусім забывае, што ад падобных дзеянняў церпяць не толькі вушка ці попка малога, але і яго псіхіка. А чаго вартыя словы, якія злятаюць з матуліных вуснаў: "Як ты мне надакучыў! Ва ўсіх дзеці як дзеці, а ў мяне". Яны ганьбяць малыша, прыніжаюць і іх пачуццё ўласнай годнасці.*

Зразумела, што ад падобных дзеянняў дзіця пачынае нервавацца, гучна плакаць, не разумеючы, чаму з ім так абышліся. А ягоная маці, упэўненая ў правільнасці ўчыненага, накіроўваецца ўперад, пакінуўшы разгубленага і заплаканага малыша на дарозе. Маўляў, няхай падумае над сваімі паводзінамі і над тым, што будзе рабіць, калі маці за ім не вернецца.

На жаль, многія суграмадзяне ў гэтай сітуацыі спачуваюць дарасламу, а не малышу. І чуецца знаёмае: "Гэтыя дзеці такія нявыхаваныя! Збалаваныя, некіруемыя!" А самае дзіўнае, што ў нявыхаванасці ўласных дзяцей самі бацькі абвінавачваюць абы каго, толькі не сябе. Хлапчук-падлетак мацюкаецца? Гэта таму, што суседскія дзеці яго навучылі. У сям'і ж ніхто не брыдкасловіць! Дзіця не слухаецца, грубіяніць? Гэта таму, што ў дзіцячым садку за ім дрэнна даглядаюць, не даюць належнага развіцця. Ну і, нарэшце, самае распаўсюджанае: дзіця адстае ў школе па прадметах, бо настаўнікі дрэнна вучаць.

У дарослым асяроддзі яшчэ вельмі актуальна абвінавачваць Захад з яго "рэвалюцыямі", навамодную музыку, якая адмоўна ўплывае на псіхіку моладзі, камп'ютэры, якія адцягваюць увагу рабят ад вучобы, а яшчэ тэлебачанне за непрадуманасць праграм і засілле "парнухі" з "чарнухай" і г.д. Але ці задумваюцца тыя ж дарослыя, што зрабілі яны самі для таго, каб іх дзеці зачыталіся Пушкіным, любілі і берaглі прыроду, належным чынам вучыліся, цікавіліся мастацтвам?

Між тым, усё пачынаецца з сям'і. Гэта бясспрэчная ісціна. На справе ўсё атрымліваецца інакш, і дзіця замест таго, каб быць у цэнтры ўвагі сусвету пад назвай "сям'я", часта застаецца сам-насам са сваім маленькім светам мар і фантазій. Бацькам, асабліва тым, хто ставіцца да дзяцей толькі як да перашкоды, якая блытаецца пад нагамі, гэты свет зусім нецікавы. І малыш, не знайшоўшы ўвагі і разумення ў дарослых, днямі праседжвае перад экранам тэлевізара, глядзячы ўсе праграмы без разбору, у тым ліку і не прызначаныя для дзіцячага ўспрымання, з галавой акунаецца ў віртуальную прастору камп'ютэра, атрымлівае інфармацыю аб навакольным свеце, адносінах паміж людзьмі ад аднагодкаў на вуліцы. Дык калі становішча спраў такое, чаму здзіўляцца нявыхаванасці дзяцей і падлеткаў, іх непадрыхтаванасці да ўступлення ў складаны і супярэчлівы свет дарослага жыцця? І пры чым тут праславуты Захад з яго "адмоўным" уплывам на моладзь, калі ўласная сям'я не ў стане сагрэць дзіцячую душу, зразумець і падтрымаць, навучыць правільна ўспрымаць жыццё.

Вось і атрымліваецца, што нашы рана пасталеўшыя дзеці, уступаючы ў складаны свет дарослых, маюць падманныя звесткі аб ім. Жыццё для іх ужо не асацыіруецца, як у дзяцінстве, з казкай. Свет летуценняў, памкненняў і мар аб прыгожым каханні ўступае месца жорсткай рэчаіснасці. Таму дзеці, падрастаючы, становяцца раздражальнымі, непаслухмянымі, свавольнымі. У выніку церпіць не толькі сям'я, але і грамадства ў цэлым. Каб гэтага не здарылася, а дзеці ў будучым не адчувалі сябе няшчаснымі і непатрэбнымі, з адчаю і бязвыхаднасці не нарабілі непапраўных памылак, трэба з самага маленства берагчы іх душу, паважаць іх чалавечую годнасць, паказваць лепшыя прыклады выхавання, захаваць крохкі свет дзяцінства, а галоўнае – проста любіць сваіх дзяцей! Гэтага яны вартыя ўжо толькі за тое, што дзеці. Забудзем аб папроках і крыўдах, не будзем раздражняцца па дробязях, а скажам сыну, дачцы: "Я люблю цябе! І ў нас з табой яшчэ ўсё атрымаецца..."

**Таццяна ЦЕЛЯХОВІЧ,**
**студэнтка 4 курса філалагічнага факультэта.**

ТЭАТР

## ГУЛЬНЯ ФАНТАЗІІ І ВЕЛІЧ КАХАННЯ

Вядома, што драматургічныя творы толькі тады "жывуць", калі яны актыўна ставяцца на сцэне. П'есу Аляксея Дударава "Чорная панна Нясвіжа" гамяльчане ўбачылі адразу ў дзвюх рэжысёрскіх рэдакцыях: Віцебскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я.Коласа (сцэнічная версія назвы – "Я – грэшніца"), дзе гістарычны бок п'есы ўмацаваны скразным псіхалагічным дзеяннем з вобразам Пачвары, і Гомельскага абласнога драмтэатра, які прадставіў феерыю, сатканую з колера, асвятлення, гука, – два цудоўныя спектаклі, два сцэнічныя ўвасабленні драматургічнай задумкі аўтара.

Сучасная публіка ўжо стамілася ад таго бруду, які бачыць штодзённа вакол сябе, перасыцілася і вобразамі з сучаснага шэрага, бязрадаснага і бязлітаснага жыцця. Сёння востра адчуваецца недахоп прыгажосці, культуры высокіх пачуццяў і адносін. Таму зразумела імкненне рэжысёра, народнага артыста РБ Валерыя Раеўскага вырашыць сцэнаграфію спектакля "Чорная панна Нясвіжа" сродкамі прыгожага, што складаюцца з цудоўнага музычнага афармлення, асвятлення, колера і раскошнага аддзення дзеючых асоб, у прыватнасці каралевы Боны і яе світы – фрэйлін. Усе касцюмы для гэтага спектакля створаны ў нашай, гомельскай тэатральнай майстэрні, усё: ад эскізаў да апошняга шва. Пышнае адзенне акцёраў дапаўняе зрокавы рад пастаноўкі, ствараючы ўражанне сапраўднага касцюміраванага шоу, што дадае драматычнай інтрызе прыгажосці, падкрэслівае амаль што дакладны каларыт эпохі Рэнесансу.

На сцэне – мінімум дэкарацый: квадратны "пастамент" разбіты на прамавугольнікі, якія нагадваюць ігральныя карты ("Што нашае жыццё? – Гульня!"). Па краях, злева і справа, бліжэй да куліс, – жаўтавата-васковыя фігуркі-статуэткі, падобныя на скульптуры святых у каталіцкіх храмах; у руках гэтых фігурак – свечкі, якія адыгрываюць нейкую сімвалічную ролю: ці замест змены дэкарацый, калі кожная новая дзея адбываецца ў іншым месцы, ці для таго, каб адцяняць нейкую ступень духоўнай прысутнасці (у адмоўнай энергетычнай сітуацыі яны тухнуць, а ў станоўчай – загараюцца). У спектаклі В.Раеўскага шмат сімвалаў і сімвалічных дэталяў. З самай першай сцэны глядач, нават не ведаючы гістарычнай асновы п'есы, ужо пранікаецца атмасферай трагедыі.

Музычны бок сцэнічнай дзеі нагадвае гукавую сімфонію. У сумную, журботную сцэну-пантаміму сімвалічнага пахавання Барбары раптоўна моцна і нахабна ўрываецца мелодыя старадаўняга салоннага танца, дынамічнага і азартнага. Гэта – гукі шумнага балю ў замку Барбары, якія яшчэ не аднойчы ўзнікнуць на працягу пастаноўкі.

Не менш цікавая і сімфонія колеру. Можна сказаць, што колер у гэтай пастаноўцы – раўнапраўная дзеючая асоба, ён выкарыстаны цудоўна, выяўленча, псіхалагічна дакладна. Перш за ўсё – гэта чорна-белы колеравы кантраст. У касцюмах Анёлаў увасоблена псіхалагічная дваістасць. З аднаго боку, белы – абсалютны колер святла, сімвал чысціні. Адначасова ён мае і некаторыя негатыўныя значэнні – страх, халоднасць, бледнасць смерці. Белы колер – пазітыўны бок антытэзы "чорнае – белае". Чорны – сінонім няшчасця; як колер журбы, ён дэманструе страту, злавесныя прадказанні.

Уся колеравая нагрузка ў сцэнічнай пастаноўцы ўскладзена на каралеву Бону і яе фрэйлін. Першы выхад Боны Сфорцы (народная артыстка РБ Л.Корхава) суправаджаецца цёмна-зялёным колерам (колер жыцця), у ім Бона атрымлівае навіну аб тым, што сын яе моцна закаханы ў літоўскую панну з магутнага роду Радзівілаў; а бледна-зялёныя сукенкі яе світы ўвасабляюць тэму зайздрасці прыдворных, рэўнасці маці, хваробы, што неўзабаве напаткае Барбару. Так мовай колера рэжысёр нібыта ўводзіць у падсвядомасць нічога не падазраючага гледача думку аб псіхалагічнай драме герояў, якая мае адбыцца.

Другая сцэна ў пакоях Боны вырашана ў бела-чырвоных танах. Каралева-маці, апанаваная жаданнем перашкодзіць намеру Жыгімонта (акцёр А.Карака) ажаніцца з Барбарай (актрыса В.Хайкова), нейтралізаваць каханне, дасылае сватоў да Габсбургскай прынцэсы. Адбываецца сур'ёзная размова паміж маці і сынам. Даказваючы свае права на каханне, Жыгімонт (па "заданню" рэжысёра) нават замахваецца на маці (чаго няма ў п'есе Дударава!). Гэта вельмі напружаная сцэна ў спектаклі. Таму, відаць, і вырашана яна ў белачырвоным колеры, бо ў сімволіцы чырвонага прысутнічае негатыўны аспект – зло, жаданне крыві, адкрытая агрэсія. Чырвонае ж на белым, магчыма, сімвалізуе і смяротную небяспечнасць.

Жоўты колер з усіх асноўных колераў найбольш супярэчлівы па сваёй сімволіцы: цёплы жоўты колер царственнасці, годнасці і цэнтра ў той жа час азначае здраду. Бона ў жоўтым – бліскучая каралева чысцюткіх італьянскіх крывей – здраджвае свайму сыну. Яна асмельваецца на тыпова каралеўскі крок дзеля дасягнення сваёй мэты, якая пярэчыла ўсім маральным нормам, але была ў духу эпохі Адраджэння: падсылае да ненавіснай літоўкі свайго прыдворнага, які хітра падсоўвае Барбары бутэлечку з атрутай працяглага, але няўхільнага дзеяння. Ці гэта не здрада, хаця і ў імя дзяржаўных мэтаў?

У сцэне каранавання Жыгімонта і Барбары пануе бела-блакітны колер. Спалучэнне сіняга, белага і залатога (дзьве кароны для абраду) – эмблематычны сімвал ісціны, якая цесна звязана са святлом навогул, таму гараць свечкі ў руках васкавых фігурак святых, святлом азораны лік іконы.

Ісціна... Якая ісціна? І ў чым яна? Няма неабходнасці шукаць яе ў колеры, свеце, сімвалах, не трэба дэталёва прэпарыраваць спектакль, раскладаць яго на элементы, састаўныя часткі, вобразы. Тым больш, што з часоў Радзівілаў нічога істотна не змянілася. Мы навучыліся абараняць свае ідэалы, але страцілі здольнасць да сапраўднай, ахвярнай Любові; мы навучыліся змагацца з хваробамі, але кахаць адзін аднаго развучыліся. Кахаць так, як кахалі Барбара Радзівіл і Жыгімонт Аўгуст – страсна, шчыра. Духоўна-душэўную чысціню іх адносін сімвалічна прадставіў у сваёй рэжысёрскай пластычнай канцэпцыі В.Раеўскі: вытанчаная сцэна любоўнага спаткання ў спальні Барбары вырашана ва ўзнёслай манеры лепшых шэкспіраўскіх традыцый.

Спектакль "Чорная панна Нясвіжа" ў пастаноўцы арыгінальнага мастака сцэны рэжысёра Валерыя Раеўскага – гэта ўражальная тэатральная з'ява.

**Т.АЎДОНІНА,**
**дацэнт кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі.**

ПЫТАЙЦЕ – АДКАЗВАЕМ

## АБ "ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ НАДБАЎЦЫ" ДА СТЫПЕНДЫІ

У рэктарат і прафкам студэнтаў паступіла шмат запытаў, чаму на працягу доўгага часу не выплачвалася 50-працэнтная надбаўка да стыпендыі. На гэта пытанне адказвае старшыня прафкама студэнтаў **Н.І.Колтышава:**

– Фінансаванне 50-працэнтных надбавак да стыпендый ажыццяўляецца з Рэспубліканскага бюджэту ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад аварыі на ЧАЭС" праз райфінаддзел Чыгуначнага раёна г.Гомеля. У студзені г.г. рэктарат двойчы, а ў лютым у трэці раз звяртаўся пісьмова да яго загадчыка з просьбай паскорыць пералічэнне сродкаў на выплату чарнобыльскіх надбавак. У выніку неабходная сума грашовых сродкаў за снежань 2001 года была пералічана і выплаты пачаліся з 28 лютага. Надбаўкі за студзень і люты бягучага года будуць выплачаны ў апошняй дэкадзе гэтага месяца.

Н.І.Колтышава нагадала таксама, што тыя студэнты, якія па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі не заслужылі вучэбных стыпендый, маюць права на сацыяльныя (не больш двух разоў за ўвесь перыяд вучобы). Для гэтага неабходна напісаць адпаведную заяву.

## ВЕСЕННИЙ РЕПОРТАЖ

Март! Месяц-мечта, месяц-мираж. Именно он намечает яркую черту, четкий предел, за которым остается белое холодное уныние, неуютность и серость капризных белорусских зим.

А за этим пределом, за этой чертой – весна! Ее теплое дыхание чувствуется даже в студеных, неистовых порывах бурных и неожиданных метелей постаревшего февраля. И согретая земля безжалостно съедает мокрые хлопья последнего серого снега, тяжелыми комьями лениво падающего с низкого неба.



"Все хорошее когда-нибудь заканчивается", – сетуем мы. Но ведь хорошее с чего-то и начинается. И каждая новая весна становится предзнаменованием, началом всего лучшего, хорошего. Весна – символ возрождения, тепла, любви, она – воплощение самой жизни, чьи пульсирующие ритмы, подобно волшебному трезвону благовещенских колоколов, смелой побудкой разливаются по сонной земле, стремительно достигая каждой живой клеточки, каждого бестрепетного сердца. И – чудо! Все вокруг неузнаваемо изменяется: цвета, звуки, запахи; изменяемся и мы, уставшие, постаревшие, ставшие бесцветными за долгие бессолнечные зимние месяцы, мы становимся другими, разбуженные свежим ветром перемен. Новые желания, ощущения, новые мечты и, наконец, мы сами – новые, готовые к любви, к счастью, к весне...

**Т.КОЗЕРОЖЕЦ,**
**студентка гр. Р-31 филфака.**

**Кацярына КАРАТЫШ,**
**студэнтка гр. Б-32**
**філалагічнага факультэта.**

## МАМЕ

*Толькі зараз, калі ад дома*
*Зноў далёка знаходжуся я,*
*Зразумела, як дорага мама,*
*Мне адзіная мама мая.*
*Ты ў дзяцінстве нас атуляла,*
*Саргавала пяшчотай, цяплом,*
*У калысцы маленькіх люляла*
*Ці то цёмнаю ночкай, ці днём.*
*Ты была нашых сноў вартаўніцай,*
*Каб ніхто іх парушыць не змог,*
*Тым анёлам, якога ў капліцу*
*На зямлю пасылае Бог.*
*Як змагла ты так утрымацца*
*У штодзённай віхуры жыцця,*
*Нават духам не пасці, не здацца,*
*У свет дзівосны вярнуцца быцця?*
*Надзялі мяне тою часцінкай,*
*Асвяці той свянцонай вадой.*
*Хай зліваюцца ўсе ручаінкі*
*З хуткацечнасцю маці-ракой.*





## ЕЩЕ НЕСКОЛЬКО СЛОВ ДЛЯ НЕЕ...

Праздник 8 Марта. Кого поздравить в первую очередь? Ну, конечно, ее... Нежные, добрые руки, светящиеся любовью и нежной заботой глаза, приятный, привычный голос... Мама... Ты... Ты самая, самая. Такой праздник, как этот, нужен. Для чего? Для того, чтобы в очередной раз сделать приятно, чтобы снова и снова видеть эту улыбку, излучающую какую-то светлую энергию. Ведь тяжесть повседневных забот, суета – все это пытается помешать сказать еще хоть несколько ласковых слов. Обстоятельства разлучают нас на долгое время. Но эти же обстоятельства: праздник, весна дают мне возможность поздравить и еще раз сказать, что, что... Милая мамочка, я тебя люблю. Через всю жизнь я пронесу твое тепло и ласку.

*Мам, ты у меня единственная... и... я уверена, лучшая в мире.*

*Мама у каждого из нас – единственная...*

*Не стоит забывать об этом...*

**Даша СТРЕЛЬЧЕНКО,**
**студентка гр. БЖ-12**
**филологического факультета.**

### МИР ЦВЕТОВ – МИР ПРЕКРАСНОГО

"Существует счастье щадить и жалеть красоту, есть счастье чувствовать красоту, есть счастье дарить красоту..."

*(Из книги Софу Тэсигахара "Завещание цветов")*

## ДЛЯ УКРАШЕНИЯ ПРАЗДНИЧНОГО СТОЛА



Фреезия – одно из самых изящных клубнелуковичных растений семейства ирисовых. Родина ее – Южная Африка, где в жаркий период надземная часть растения отмирает. В культуру фреезия введена в конце 19 века. Наибольшей популярностью пользуется вид фреезия переломанная. Название она получила из-за строения соцветия – цветоносы изогнуты почти под прямым углом, а цветы прикрепляются к нему перпендикулярно, точно петушиный гребень. Околоцветник в основании узкотрубчатый, вверху расширяется в колокольчатую верхнюю часть. Цветы обладают замечательным ароматом. Селекционеры добавили к этому окраску цветов. Прелестные оттенки желтого, розового, голубого с переходом в красные и коричнево-фиолетовые тона сделали фреезию привлекательной как для зрения, так и обоняния. Выведены также суперфреезии со стрелками высотой до 1 м и цветами диаметром свыше 5 см.

Ценность фреезии в возможности получения срезки зимой и весной. Для этого мелкие луковички высаживают в горшки и выдерживают в светлом прохладном помещении. Через 12 недель появляются цветоносы. Срезают фреезию, когда распустятся первые 1-2 цветка. В срезке она стоит 10-12 дней без дополнительного питания.

Букетами из фреезии в сочетании с розами, гвоздикой, мимозой украшают праздничные столы. Ароматные букетики из 3 и более веточек фреезии дарят женщинам в день 8 Марта. На языке цветов фреезия означает глубокую привязанность.

**Р.МАРКЕЛОВА,**
**доцент кафедры ботаники и физиологии растений**

## УЛЫБНИТЕСЬ!

Один директор НИИ договорился с директором цирка, и в НИИ стали приводить львов и выпускать их в рабочее время в коридоры, чтобы сотрудники работали, не болтались. Потом случилось ЧП, и львов убрали. Один лев другому:

– И нужна была тебе эта уборщица! Я 17 научных сотрудников съел, и никто не заметил!

* * *

– Какая разница между женщинами и комарами?

– Комары нам надоедают только летом.

* * *

Обычно на свадьбах крадут невесту, а у меня украли тещу. Более дорогих подарков не было.

* * *

Муж с женой ругаются:

– Неблагодарный! Я отдала тебе лучшие годы своей жизни!

– Если это были лучшие, то можно представить себе, что меня ждет в будущем!

* * *

Муж: Дорогая, где сахар? Жена: За пять лет, бестолочь, мог бы выучить – сахар в банке от кофе, на которой написано "Соль". Но сейчас там его нет.

### ФРАЗЫ

- Женщина никогда не знает, чего она хочет, но не успокоится, пока этого не добьется.
- Длинные ноги – не роскошь, а средство передвижения.
- То, что женщине по душе, мужчине не по карману.



У віхры танца.
Фота У.ЧЫСЦІКА.

## МУДРЫЕ МЫСЛИ

Без женщины начало нашей жизни было бы лишено помощи, середина – удовольствий и конец – утешения.

**Н.ШАМФОР.**

Хорошая жена – спасение жизни.

**КАБУС, таджикский поэт.**

Супружество с хорошей женщиной – это гавань в буре жизни, а с плохой – это буря в гавани.

**Д.ПТИТСЕН, французский писатель.**

Благоразумная жена! Если ты хочешь, чтобы муж твой время проводил с тобой, то заботься о том, чтобы он ни в каком другом месте не находил столь приятного удовольствия и нежности.

**ПИФАГОР, древнегреческий философ.**

Жена, не ведущая мужа вперед, непременно толкает его назад.

**Д.МИЛЛЬ, английский философ.**

Женщина – великая воспитательница мужчины.

**А.ФРАНС, французский писатель.**

Жизнь научила нас тому, что любовь состоит не в том, чтобы не отрывать друг от друга глаз, а в том, чтобы смотреть вместе в одном направлении.

**Антуан де Сент ЭКЗЮПЕРИ, французский писатель.**

ХОЗЯЙКАМ НА ЗАМЕТКУ

## НЕ ДОПУСКАЙТЕ ОШИБОК НА КУХНЕ

Не употребляйте чайную заварку, простоявшую более 6 часов: к этому времени в ней образуются вредные для организма вещества. Наверное, вы не раз замечали на стенках чайных чашек трудноотмываемую коричневую пленку. При употреблении старой заварки такая же пленка покрывает стенки вашей печени, затрудняя ее работу.

* * *

Многие хозяйки заготавливают листья петрушки, пересыпая их солью. Этого делать нельзя! При хранении с солью в петрушке образуются нитрозолины – вещества, способные вызвать злокачественные опухоли.

* * *

Петрушка, ее корни и зелень в сочетании с укропом, луком, чесноком и плодами рябины, особенно красной лесной, очень эффективны при лечении гипертонической болезни.

* * *

Заливая в термос крутой кипяток, никогда не закрывайте его пробку сразу же. Закрыв сразу, вы получите ту самую мертвую воду, которая часто упоминается в русских сказках. Дайте термосу постоять открытым минуты 2-3 и только тогда закупоривайте.

* * *

1 столовая ложка ягод шиповника, заваренная одним стаканом кипятка, обеспечивает суточную потребность организма в витамине С. Замачивать и заваривать шиповник нужно в непрозрачной посуде, так как на свету разлагается витамин С. Здесь наиболее удобен термос. Положите в него 25-30 ягод на 1 литр кипятка на ночь, приблизительно на 7-8 часов, и к утру напиток будет готов!

### ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:
– тэарэтычнай фізікі – дацэнта;
– рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства – асістэнта;
– гісторыі Беларусі – асістэнта;
– тэорыі і практыкі англійскай мовы – выкладчыка (2);
– англійскай мовы – выкладчыка;
– нямецкай мовы – выкладчыка;
– эканамічных тэорый – дацэнта.

Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Калектыў кафедры палітычнай сацыялогіі выказвае глыбокае спачуванне лабарантцы **Вашкевіч Ірыне Анатольеўне** з выпадку напаткаўшага яе гора – смерці **БАЦЬКІ**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71. E-mail: rggu@gsu.unibel.by

Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Спонсар газеты — прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 106.
Падпісана да друку 04.03.2002 г.